аховы тэкстаў і баз даных. Найбольш простыя крыптаграфічныя спосабы аховы інфармацыі статычны і дынамічны. Дынамічная крыптаграфія можа ўжывацца пры распрацоўцы прыкладнога праграмнага забеспячэння. У выпадку выкарыстання выконваемых модуляў для апрацоўкі інфармацыі ці ў выпадку неабходнасці апрацоўкі інфармацыі рознымі праграмамі пытанне значна ўскладняецца. Адзначым, што метады крыптаграфіі не абараняюць інфармацыю пры некваліфікаваным абыходжанні ці наўмысным пашкоджанні.

У выпадку статычнай крыптаграфіі даныя застаюцца даступнымі пры аварыйным заканчэнні работы. Як для статычнага, так і для дынамічнага рэжыму актуальным застаецца пытанне надзейнасці шыфраў і бяспекі аперацый шыфроўкі і дэшыфроўкі.

Для вырашэння праблемы аховы тэкставых файлаў намі быў абраны падыход, ў якім выкарыстоўваецца перавызначэнне структурных адзінак, звязаных з фізічнымі асаблівасцямі захоўвання інфармацыі на дысках. Гэты спосаб не выключае некаторыя недахопы, звязаныя з абслугоўваннем дыскаў, але на даным этапе ўкаранення вылічальнай тэхнікі ў навучальны працэс універсітэта можа быць эфектыўна выкарыстаны для аховы інфармацыі рознага тыпу ад несанкцыяніраванага доступу.

Дзямешка Л.А.,
прафесар

## АСВАЕННЕ СТУДЭНТАМІ СУЧАСНЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА «БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ»

Згодна з вучэбнай праграмай у курсе «Бібліятэчнае абслугоўванне» вылучаны раздзел «Структура, сістэма і тэхналогія бібліятэчнага абслугоўвання». У гэтым раздзеле вывучаюцца тэмы «Развіцце формаў бібліятэчнага абслугоўвання", "Арганізацыя і тэхналогія бібліятэчнага абслугоўвання на абанеменце, у чытальнай зале, цераз нестацыянарныя формы, па МБА і міжнароднаму МБА».

На лекцыях студэнты атрымліваюць веды па дыспетчарызацыі бібліятэчных цыклаў, рэгуляванні руху дакументаў і чытацкіх запатрабаванняў, тэрмінаў і паслядоўнасці выканання працэсаў і аперацый апрацоўкі дакументаў і чытацкіх запатрабаванняў, накіраваных на павышэнне якасці вынікаў бібліятэчнага абслугоўвання. Пры вывучэнні тэмы «МБА: тэхналогія функцыянавання» студэнты знаёмяцца з традыцыйным і аўтаматызаваным тэхналагічным рэжымам на прыкладзе буйных галіновых цэнтраў і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Падчас вытворчай практыкі яны прымаюць непасрэдны ўдзел у выкананні паслядоўна аўтаматызаваных працэсаў: увод новых паступаючых заказаў, перадача іх у фонды, зварот з фондаў, перадача заказаў абанентам, зварот дакументаў ад абанентаў, зварот іх у фонды, перанакіраванне запытаў.

На лекцыі даецца паняцце аб сістэме абслугоўвання карыстальнікаў CORI, якая прыцягнула да сябе ўвагу бібліятэк Расіі і некаторых краін СНД. Цікавяць студэнтаў і сродкі вылічальнай тэхнікі: статыстычныя лічыльнікі для вядзення штодзённай бібліятэчнай статыстыкі, электронныя калькулятары, лічыльна-лічбавыя машыны серыі «Электроніка» (БЗ-ОБМ, МК-59, С3-22, МК-42, МК-44) для ўліку вынікаў абслугоўвання, складання планаў і справаздач.

Практыка дае магчымасць пры авалоданні тэхналогіяй бібліятэчнага абслугоўвання пазнаёміцца з выкарыстаннем АС непасрэдна ў бібліятэцы: міні-ЭВМ, ПЭВМ, лазернага прынтэра, камплекта літаратуры для нанясення і злічвання штрыхавых кодаў, лакальнай вылічальнай сеткі, прыстасаванняў аднаразовага запісу і шматразовага счытвання інфармацыі на аптычных кампакт-дысках і інш.

На жаль, асваенне студэнтамі сучасных інфармацыйных тэхналогій магчыма пакуль што толькі на базе буйных бібліятэчных цэнтраў і падчас вытворчай практыкі ці самастойнай навуковай працы. Камп'ютэрныя лабараторыі Беларускага універсітэта культуры перагружаны, сучасных ПЭВМ не хапае.

Алянюк Н.В.,
выкладчык

## ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАКТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ФОНДЫ»

Курс «Бібліятэчныя фонды» з'яўляецца адным з вядучых, фундаментальных курсаў, якія забяспечваюць студэнтаў спецыяльнымі ведамі. Існуючая праграма курса, як сведчаць вынікі вывучэння гатоўнасці выпускнікоў да выканання сваіх функцый у бібліятэцы, у прынцыпе забяспечвае атрыманне неабходных ведаў для працы з фондамі. Згодна з данымі, каля 2/3 студэнтаў дастаткова высока ацэньваюць свае веды і практычныя навыкі і адчуваюць упэўненасць на гэтым накірунку работы. Хочацца заўважыць, што кожны пяты выпускнік жадаў бы займацца ў бібліятэцы менавіта працэсамі фарміравання і кіравання фондамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядучыя спецыялісты бібліятэк мяркуюць аб здольнасці маладых спецыялістаў забяспечыць гэтыя ўчасткі працы болей стрымана, прычым асноўным недахопам у адукацыі лічыцца недастатковая практычная накіраванасць навучання.

Шляхі ўдасканалення практычнай накіраванасці выкладання курса «Бібліятэчныя фонды» бачацца ў двух накірунках.

1. Актуалізацыя зместу курса, адлюстраванне ў ім усёй разнастайнасці фондавых праблем сучаснай бібліятэчнай практыкі. Маючы на ўвазе, па-першае, змены ў кнігавыдавецкай справе, якія прывялі да скарачэння аб'ёму і змянення структуры кніжнай прадукцыі, складанасцей утварэння новай сістэмы кнігазабяспячэння бібліятэк; уплыў эканамічных фактараў на працэсы каардынацыі і кааперацыі фарміравання фондаў. Існуючыя праграма і змест курса пабудаваны з улікам умоў работы бібліятэк Беларусі. Уведзены новыя раздзелы, дзе разглядаюцца альтэрнатыўныя крыніцы камплектавання, праблемы фарміравання адзінага бібліятэчнага фонду РБ і ўзаемаадносіны паміж яго як традыцыйнымі, так і новымі элементамі, уплыў выдавецкай палітыкі на стан і развіццё бібліятэчнай справы і інш.

Па-другое, вынікам дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі з'яўляецца паступовае змяненне лінгвістычнай структуры бібліятэчных фондаў, узмацненне тэндэнцый да пашырэння фондаў краязнаўчай тэматыкі. Гэта патрабуе ад бібліятэчных спецыялістаў валодання прыёмамі рацыянальнага камплектавання фонду з улікам нацыянальнага складу, мовай, якой аддаецца перавага пры чытанні літаратуры рознага зместу, навыкамі стварэння моўных мадэлей бібліятэчнага фонду на падставе канкрэтнага аналізу лінгвастановішча.

Па-трэцяе, укараненне АБІС у практыку бібліятэк робіць неабходным ажыццяўленне паралельнага навучання як традыцыйным тэхналогіям фарміравання фондаў, так і заснаваным на ўжыванні сучаснай вылічальнай тэхнікі.

2. Актывізацыя працэсу навучання, паглыбленне ведаў, уменне выкарыстоўваць гэтыя веды на практыцы. Сярод шматлікіх сродкаў, якія дазваляюць зрабіць вучэбны працэс больш інтэнсіўным, у дадзеным выпадку вылучым наступныя:

- шырокае ўжыванне актыўных метадаў вывучэння курса (дзелавых гульняў, дыскусій, мадэліравання і канструявання рэальных сітуацый і інш.);
- практычная накіраванасць самастойнай работы, выкананне кантрольных і творчых работ у цесным узаемадзеянні з бібліятэчнымі ўстановамі.

Рэалізацыя гэтых напрамкаў пры вырашэнні праблем метадычнага і арганізацыйнага характару дазваляе больш цесна спалучаць працэс навучання з бібліятэчнай практыкай,сфарміраваць у будучага спецыяліста сістэмнае, комплекснае ўяўленне аб дзейнасці бібліятэк па фарміраванню фондаў.

Суддзя Э.С.,
дацэнт

## СУАДНОСІНЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА І ЎСЕАГУЛЬНАГА Ў ВУЧЭБНЫМ КУРСЕ «БІБЛІЯГРАФІЯ МАСТАЦТВА»

1. Суадносіны адзінкавага, асаблівага і ўсеагульнага вывучаюцца філасофіяй, яны раскрываюць аб'ектыўныя сувязі сусвету і характарызуюць працэс яго пазнання. Адзінкавае трактуецца філосафамі як форма існавання ўсеагульнага ў рэчаіснасці, асаблівае - як ўсеагульнае, рэалізаванае ў адзінкавым.

2. Беларускае мастацтва з'яўляецца асаблівай формай адлюстравання мастацкай рэчаіснасці, раскрывае магчымасці адлюстравання, рэалізацыі ўсеагульнага ў адзінкавым.

3. Раскрыццё гэтых асаблівасцей узаемаадносін у вучэбным курсе «Бібліяграфія мастацтва» можа ісці па двух напрамках: паказ тоеснасці, узаемаўплыву, з аднаго боку, і спецыфікі, самастойнасці, з другога.

4. Не толькі кожны раздзел курса, але і блок блізкіх па праблематыцы тэм і нават асобныя тэмы дазваляюць выкарыстаць абодва падыходы да адлюстравання суадносін нацыянальнага і ўсеагульнага

5. Унутры першага раздзела на фоне агульных тэарэтычных і метадалагічных праблем адлюстроўваюцца асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтву ў Рэспубліцы Беларусь, спецыфіка патрабаванняў і запытаў беларускіх спажыўцоў інфармацыі, спецыфіка фарміравання і функцыянавання патокаў і масіву па розных відах мастацтва: выяўленчым, прасторавым, музыцы, тэатру, кіно і інш.

6. Другі раздзел курса дазваляе раскрыць асаблівасці бібліяграфавання выданняў па мастацтву, твораў мастацтва і мастацтвазнаўчай літаратуры ў Беларусі, супаставіўшы іх з агульным вопытам па стварэнню і эксплуатацыі бібліяграфічных баз дадзеных па мастацтву ў цэлым і асобных яго відах.

7. Трэці раздзел курса прадугледжвае вывучэнне асаблівасцей абслугоўвання чытачоў па эстэтычнаму комплексу розных тыпаў бібліятэк рэспублікі і суадносіны іх з вопытам краін блізкага і далёкага замежжа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ